…ЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

…№ 103 (1372) ‖ ПЯТНІЦА, 8-га мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Да зьезду профсаюзаў

…асталося каля трох тыдняў да …атку чарговага ўсебеларускага …зду профсаюзаў.

…ьезд зьбіраецца ў час сканчэнь… першых двух месяцаў другога …ртлу 3-га рашаючага году пяці-…кі, калі партыя і пад яе кіраў… …бочая кляса з нябывалай …ргіяй змагаецца за выканань… …кантрольных лічбаў 3-га рашаючага году пяцігодкі ў найкарацей… час.

…інулы прадзьездаўскі пэрыод … рэзкі пералом: профсаюзная …анізацыя, вызваліўшыся ад ста…а права-опортуністычнага кіраў…тва, пад кіраўніцтвам комуні…ычнай партыі пашла на сапраўды …вільным шляху, шляху карэн…а павароту да задач соцыялістыч…га будаўніцтва, павароту тварам … вытворчасьці.

Карэнная перабудова работы …офсаюзаў, перабудова ўсёй сыс…ы ў адпаведнасьці з задачамі …творчасьці—вось конкрэтныя ме…рыемствы па замацаваньню …зейсьненага павароту тварам да …ач гаспадарчага будаўніцтва.

„Задачы комсамолу ў профсаю…х: заняць зараз больш перадавыя …зыцыі ў справе перабудовы і на…ашаньня работы профсаюзу. Профсаюзы зараз робяць далейшыя кро… ў справе паляпшаньня сваёй ра…ты... Неабходна, каб профсаюзы …цягнулі ў сваю работу комсамоль…ія масы, каб комсамольская маса …ыняла больш удзел у рабоце …офсаюзаў“ (Кагановіч).

У гэты-ж час на некаторых ор…нізацыях ёсьць яшчэ даўнае неразуменьне данага пэрыоду, калі комсамол з профсаюзамі выходзіць ужо …іным фронтам у барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва, калі разьмычка, якая існавала ў свой час, …асьля мінулых спрэчак зьнішчана … спрэчкі вырашаны.

Яскравы прыклад—гэта праца …омсамолу фабрыкі імя Лекерта. …азгортваючы конвэер якасьці, ён … здолеў прыцягнуць да гэтай …равы профсаюзныя організацыі … ўсю працоўную грамадзкасьць …тым каб разам з імі дамагацца лепшага правядзеньня вызначных ме…прыемстваў. З свайго боку, проф…саюзы Віцебску яшчэ ня выжылі …ую разьмычку, якая была паміж …омсамолам і профсаюзамі на праця… доўгага часу.

Да зьезду засталося мала часу. Комсамольская організацыя павінна …араз-жа распачаць падрыхтоўчую …рацу з тым, каб сам зьезд проф…саюзаў у кароткі тэрмін, які застаўся да яго пачатку, зьявіўся-б ча…сам генэральнай праверкі ўдзелу комсамолу ў працы профсаюзаў, …сумеснай барацьбы за разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва і ўзь…няцьця яго на вышэйшую ступень, сумеснай барацьбы за хутчэйшае …равядзеньне крэдытнай рэформы, барацьбы за кадры для соцыялістычнай прамысловасьці.

Зьезд профсаюзаў павінен будзе зьявіцца стымулам для яшчэ большага наглыбленьня працы, якая разгорнута, для таго, каб дабіцца ў сумеснай барацьбе комсамолу з профсаюзамі яшчэ большых посьпехаў.

Да гэтага зьезду неабходна разгарнуць баявую падрыхтоўку і праверку зараз-жа.

НАРАСТАНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ ПАГРОЗАЙ СЬМЕРЦІ НАВІСАЕ НАД КАПІТАЛАМ

ДЭМАНСТРАЦЫІ РАБОЧЫХ І ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ

Дамброўскія гарнякі рыхтуюцца да забастоўкі

Узброеныя выступленьні паліцыі супроць беспрацоўных

Арышты і вобыскі сярод гарнякоў

ВАРШАВА, 5.—Канфлікт паміж гарнякамі і шахтаўласьнікамі Дамброўскага каменавугольнага раёну аб вастраецца. Шахтаўласьнікі абвясьцілі аб скасаваньні калумовы і патрабавалі значна скараціць зарплату. Пад націскам рабочых мас соцыял-фашысцкі профсаюз склікаў нараду делегатаў, на якой было прынята рашэньне абвясьціць забастоўку пры першых-жа спробах уласьнікаў пагоршыць умовы працы. У адказ на гэта організацыя ўласьнікаў пагражае ўвесьці новыя ўмовы працы ў явачным парадку з першага чэрвеня г. г., калі профсаюзы не дадуць сваёй згоды. Мясцовая ўлада і фабрычная адміністрацыя імкнуцца ўсімі сіламі перашкодзіць організацыі рабочых. Паліцыя праводзіць масавыя вобыскі і арышты. Агульныя сходы на шахтах забаронены. Ня гледзячы на гэтыя рэпрэсіі, гарнякі ўзмоцнена рыхтуюцца да забастоўкі.

Дэманстрацыі рабочых у сувязі з гадавінай забароны саюзу „Чырвоных франтавікоў“

Бэрлін, 7.—У сувязі з мінуўшай гадавінай забароны саюзу „Чырвоных франтавікоў“, 6-га мая ўвечары ў Бэрліне адбылася дэманстрацыя рэволюцыйных рабочых. У Нэйкельне 600 членаў саюзу „Чырвоных франтавікоў“ наладзілі дэманстрацыю на вуліцах з рэволюцыйнымі сяпевамі. Паліцыя не адважылася перашкодзіць дэманстрацыі. У Вэсінге адбылася дэманстрацыя, ў якой прынялі ўдзел 2000 чалавек. Трубачы гралі марш „Чырвоных франтавікоў“, дэманстранты сьпявалі рэволюцыйныя песьні. Паліцэйскія напалі на ўдзельнікаў дэманстрацыі.

Разгул імпэрыялістычных катаў у Кітаі

БЭРЛІН. 1 „Анты-імпэрыялістычная ліга“ апублікавала заклік, у якім пратэстуе супроць зьверскага тэрору кітайскай контррэволюцыі. „Імпэрыялістыя—гаворыцца ў заклiку—з дапамогай свайго агента Чан-Кай-Шы праводзяць у Кітаі крывавы масавы тэрор. Ня маючы магчымасьці перамагчы рэволюцыйную армію, Чан-Кай-Шы і яго імпэрыялістычныя каты забіваюць тысячы непавінных сялян“ У заключэньне „анты-імпэрыялістычная ліга“ заклікае працоўных усяго сьвету організаваць мітынгі і дэмонстрацыі пратэсту супроць белага тэрору ў Кітаі і солідарнасьці з кітайскай рэволюцыяй.

Брытанскія крэйсэры сьцягваюцца ў Нанкін

ЛЁНДАН. Шанхайскі карэспондэнт „Дэйлі тэлеграф“ паведамляе, што брытанскі крэйсэр „Віндыктыў“ атрымаў загад адправіцца з Гонконга ў Нанкін. Другім крэйсэрам загадана быць у баявой гатоўнасьці, каб ў любы момант далучыцца да „Віндыктыва“

Загадзя апраўдваючы магчымыя выступленьні ангельскіх крэйсэраў карэспондэнт дадае, што ў выніку разрыву англа-кітайскіх перагавораў аб адмене экстэрыторыяльнасьці і узмацненьня руху супроць нанкінскага ўраду, ў Нанкіне чакаецца выступленьне супроць чужаземцаў.



Першамайская дэманстрацыя ў Бэрліне.

Паражэньне паўстанцаў

ЛЁНДАН. Паўстаньне на высьпе Мадэйра задушана. Пасьля нядоўгай бойкі у Мачыка паўстанцы капітулявалі. Паражэньне паўстанцаў выклікана здрадай афіцэраў, якія як толькі пачалася бомбардыроўка, дэзэртавалі і зьявіліся у ангельскае консульства, дзе знайшлі прытулак.

Паўстанцы згубілі трох забітымі і 15 раненымі, а карная экспэдыцыя аднаго забітага і 7 раненых.

Крывавыя сутычкі беспрацоўных гарнякоў з паліцыяй

НЬЮ-ЁРК, 5.—У каменавугольным раёне Харлена (штат Кентукі) адбыліся крывавыя сутычкі беспрацоўных гарнякоў з паліцыяй. Двое паліцэйскіх і ўласьнік харчовае крамы забіты. Некальні чалавек паранена. Сутычкі адбыліся ў сувязі з тым, што паліцыя, узброеная кулямётамі і вінтоўкамі, зрабіла налёт на рабочы пасёлак, з мэтай арыштаваць удзельнікаў хваляваньняў, якія адбыліся на мінулым тыдні, калі гарнякі захапілі харчовыя крамы і, абараняючыся, забілі аднаго паліцэйскага.

Забастоўка 4000 тэкстыльшчыкаў і 11.000 гарнякоў

НЬЮ-ЁРК. — У штаце Пэнсыльванія працягваецца забастоўкі 4000 тэкстыльшчыкаў і гарнякоў у знак пратэсту супроць скарачэньня зарплаты. Забастоўка 4.000 тэкстыльшчыкаў цягнецца ўжо 2 месяцы. За гэты час былі арыштаваны сотні бастуючых. Рэформісцкі профсаюз тэкстыльшчыкаў выключыў з свайго складу мясцовую профорганізацыю, якая яднае 2.000 рабочых, таму, што рабочыя адхілілі яго прапанову спыніць забастоўку і згадзіцца з скарачэньнем зарплаты на 14 проц. У антрацытавых раёнах была абвешчана забастоўка 11.000 гарнякоў. Ня гледзячы на штрэйкбрэхорскую прапаганду рэформісцкіх профбюрократаў, большасьць рабочых бастуе.

Прыдушэньне цэнзурай левай прэсы ў Латвіі

РЫГА За апошнія 2 гады левая прэса Латвіі ўсяляк прыдушаецца цэнзураю. На днях арыштаваны рэдактар і спынены выпуск органу рабоча-сялянскай фракцыі сойму —„Саркана Зем'я“

Падрыхтоўка да сьвята чырвонага спорту*)

Адным з буйнейшых мерапрыемстваў рэволюцыйна-пролетарскіх спортыўных організацый будзе інтэрнацыянальная міжнародная спартакіяда, якая праводзіцца ў Бэрліне ў ліпені месяцы.

Бэрлінская спартакіяда зьяўляецца важным зьвяном агульнага ланцугу наступленьня ЧСІ на буржуазны і соцыял-фашысцкі спортрух, адным з буйнейшых актаў у барацьбе за масавы чырвоны спорт'інтэрнацыянал.

Праграма спартакіяды

У адрозьненьне ад буржуазных олімпіяд, праграма бэрлінскай спартакіяды складзена не для рэкордсмэна, а па разрадах: да ўдзелу ў спаборніцтвах дапушчаюцца ўсе рабочыя спортсмэны, адпавядаючыя разрадным нормам, дя якіх-бы саюзаў гэтыя спортсмэны ні прымыкалі.

4 і 5 ліпеня ў Швэйцарыі, у Хэлінгензе адбудуцца спаборніцтвы па грабному спорту. У праграму ўваходзяць: навучальныя чацьвёркі, парныя чацьвёркі, васьмёркі, парныя двойкі, народная грэбля, парныя байдаркі, складаныя байдаркі (парныя і адзіночныя), чацьвёрка каноэ.

5 ліпеня на мотодроме Авус будуць праведзены мотоцыклетныя гонкі. Уключаны забегі для машын усіх катэгорый, пачынаючы з 200 куб. сант. і да 1200 куб. сант., на розныя дыстанцыі—ад 20 да 100 кілём.

5, 9, 10 і 11 ліпеня адбудуцца вэлёгонкі па шосэ, цэмантным і драўляным трэкам. Уключаны гонкі па шосэ па ўзросным разрадам на 40 км., гонкі па цэмантным трэку з лідэрамі на 25 і 50 км. і бяз лідэраў на 20 км. і па драўляным трэку—на 1,25 км., камандныя спаборніцтва на 1 мілю і камандныя гонкі (па ўзору шасьцідзённых) на 50 км.

Лёгкая атлетыка будзе праведзена з 9 па 12 ліпеня. Усе спаборніцтвы праводзяцца па двух разрадах—старэйшаму і малодшаму. Спортыўны інтарэс забясьпечан параўнаўча высокімі нормамі, прынятымі для малодшага разраду: 100 м.—12,2 с., 200 м.—26 с., 400 м.—50 с., ядро—10 м. дыск—28 м., капьё—40 м., вышыня с-р—1,50 м., даўжыня с-р.—5,70 м. і г. д. Акрамя паказаных вышэй практыкаваньняў, у праграму ўваходзяць 800 м., 1500 м. 5000 м., шост, бар'еры, бег на 110 і 400 м., эстафэты 4×100 м., 4×800 м., 10×100 м., 20×200 м., бег па горадзе на 20 км. дзесяцібор'е для моладзі і дзяцей.

З 9-га па 12-е ліпеня адбудуцца спаборніцтвы па плаваньню. У праграме заплывы ўсімі стылямі на дыстанцыі ў 100 м., 200 м., 400 м. і 2500 м., а таксама рад эстафэт. Падрабязна і рознастайна складзена праграма скачкоў,

З 6 па 12-е ліпеня праводзяцца спаборніцтвы па гімнастыцы на прыладах. Акрамя звычайных практыкаваньняў на паралельных брусьях, турніку, кабыле і інш., уведзены чатырох, сямі і дзесяцібор'і уключаючыя бег на 100 м. і скачкі.

У праграму барацьбы і падняцьця цяжару ўведзены рад індывідуальных і камандных спаборніцтваў.

Спаборніцтвы па боксу праводзяцца для ўсякае вагі з абавязковым выяўленьнем пераможцы. Працяг баёў—3 раунду па 3 м. з двума дадатковымі раўндамі па 3 м. на выпадак нічыёй.

У праграму спартакіяды ўключаны таксама спаборніцтвы па ручному мячу, травяному хоккею, тэнісу і кеглям.

Новаўвядзеньнем зьяўляецца таксама спаборніцтва па джыў-джытсу. З 6 па 11 ліпеня будуць праведзены футбольныя спаборніцтвы. Апрача розыгрышу пяршынства спартакіяды, у праграме—спаборніцтвы для мужчынскай моладзі (14—18) і вучняў (з 10—14) Спаборніцтвы праводзяцца па олімпійскай сыстэме.

Нарэшце, вялікае месца ў праграме спартакіяды займаюць адзіночныя і камандныя стралковыя спаборніцтвы (7—11 ліпеня) якія ўключаюць стральбу з буйнакалібэрнай вінтоўкі вайсковага ўзору, дробнакалібэрнай вінтоўкі, рэвольвера, пакаёвай зброі, паветранай зброі, паветранага рэвольвэра і лука.

Супроць траўлі СССР і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі

Падрыхтоўка да інтэрнацыянальнай спартакіяды ператвараецца ў самую шырокую вэрбовачную кампанію ўсіх рабочых спартсмэнаў у рады рэволюцыйных організацый.

Чырвоны Спорт'інтэрн праводзіць мобілізацыю і аб'яднаньне ўсіх пролетарыяў, якія займаюцца спортам, пад лёзунгам барацьбы супроць беспрацоўя і голаду, супроць фашызацыі і мілітарызацыі спортруху, супроць расколу рабочага спортыўнага руху Люцэрнскім спортінтэрнам супроць траўлі СССР і падрыхтоўкі да інтэрвэнцыі.

Зараз шырока разгортваецца падрыхтоўчая работа да спартакіяды і 10-цігодзя Чырвонага спортінтэрну па ўсім Савецкім саюзе, якая праводзіцца пад лёзунгам замацаваньня інтэрнацыянальнага выхаваньня фізкультурнікаў, узмацненьня міжнароднай сувязі з рабочых СССР з рабочымі спортсмэнамі і капіталістычных краін, ґрашучай перабудовы фізкультурнай работы адпаведна з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва і ўзмацненьня абараназдольнасьці Савецкага саюзу.


Траяноўскі.

(*Працяг будзе*)

*) Канец. Пачатак, глядзі ў № 98 ад 29-IV—31 г.

ПАСТАНОВУ ЦК УсеКП(б)
ПЕРАВЕСЬЦІ НА МОВУ КОНКРЭТНЫХ СПРАЎ

ОРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў КОЛГАСАХ, ПЕРАХОД НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ, СОЦСПАБОРНІЦТВ[А] І ЎДАРНІЦТВА--У ЦЭНТР УВАГІ КОЛГАСНЫХ КОМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК



Віцебская організацыя комсамолу—у паходзе

Віцебская комсамольская організацыя па прыкладу іншых організацыі 3 месяцы таму назад уступіла ў паход за ўдарнае правядзеньне падрыхтоўчай работы да 2-й бальшавіцкай і выкананьне рашэньняў партыі па колектывізацыі. Гарком комсамолу мобілізаваў 80 чалавек на вёску.

Акрамя гэтага, у красавіку былі праведзены 3 штурмавыя дні выхаду комсамольцаў гораду на вёску, прынялі ўдзел каля 300 чалавек.

Конкрэтныя вынікі работы комсамолу за гэты пэрыод наступныя: да пасылкі брыгад Віцебшчына была колектывізавана на 10 проц., а зараз раён колектывізаваны на 24 проц. скончана ачыстка насеньня, пляны сяўбы даведзены да колгасаў і аднаасобнага сэктару.

За час паходу організаваны рад новых колгасаў. У Бабыніцкім сельсавеце організаваны новы колгас з 40 гаспадарак, колгас „Молатава" вырас з 21 гаспадаркі да 155, колгас „Прогрэс" вырас на 167 проц. Колгасы сельсавету скончылі рамонт інвэнтара, склалі насенныя фонды і разьбілі рабочую сілу на брыгады.

Аднак ня гледзячы на дасягненьні ў рабоце мы маем на сёньня і значныя прарывы. ня ўсе яшчэ колгасы перайшлі на зьдельшчыну, не хапае насеньня, ёсьць комсамольскія ячэйкі, якія бязьдзейнічаюць на гаспадарчым фронце.

Чучно

КОМСАМОЛІЯ, ПРЫМАЙ ЗАГАД ПАРТЫІ!

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб рабоце колгасных комсамольскіх ячэек

1. ЦК констатуе рост політычнай актыўнасьці комсамолу і кіруемай ім моладзі ў колгасах, актыўны ўдзел у вырашэньні гаспадарча-політычных задач, праяўленьне ўсё растучай ініцыятывы ў разгортваньні соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

2. Нобач з гэтым, ЦК адзначае, што ў штодзённай і масавай працы комсамольскіх ячэек у колгасах пытаньні організацыі працы, разьмяшчэньня прыбыткаў і разьвіцьця і якаснага ўзмацненьня соц. спаборніцтва і ўдарніцтва не зьяўляюцца яшчэ цэнтральнымі пытаньнямі працы ўсіх ячэек.

3. Выходзячы з рашэньняў партыі, пастаноў 9 зьезду комсамолу і УІ-га зьезду саветаў аб рабоце на вёсцы ў колгасным будаўніцтве, комсамольскія ячэйкі павінны аддаць больш увагі гаспадарчаму ўзмацненьню колгасаў, правільнай організацыі працы, пераходу на зьдзельшчыну, лепшаму скарыстоўваньню мэханічнай і жывой сілы, разьмеркаваньню прыбыткаў па якасьці і колькасьці ўкладзенай працы, актыўнаму ўдзелу ў організацыі ўборкі і правядзеньня кантрактацыі, пры адначасовай упартай барацьбе за далейшае разьвіцьцё соц.спаборніцтва і пагалоўны ахват ім.

4. Адзначаючы слабае выкананьне дырэктывы аб стварэньні ў колгасе комсамольскай ячэйкі, абавязаць ЦК УсеЛКСМ, а таксама абкомы, райкомы і ЦК нац. компартый прыняць рашучыя меры да пашырэньня сеткі комсамолу ў колгасах і прыцягненьня ў комсамол перадавой колгаснай моладзі, асабліва юнацтва, разгарнуўшы энэргічную работу па ўцягненьню лепшых комсамольцаў-колгасьнікаў у партыю.

5. Адзначаючы недастаткова конкрэтную дапамогу комсамольскім ячэйкам у колгасах з боку ЦК УсеЛКСМ, крайкомаў, абкомаў, ЦК КСМ нац рэспублік, ЦК УсеКП(б) прапануе: устанавіць штодзённае кіраўніцтва і дапамогу колгасным ячэйкам, зьбіраючы і організуючы іх вопыт і распаўсюджаньне дадатных узораў работы, а таксама наладзіўшы жывое інструктаваньне ячэек і ўважлівы падбор работнікаў, якія накіроўваюцца на вёску. Ирапанаваць ЦК УсеЛКСМ сумесна з орг.-інструкт. адд. ЦК УсеКП(б) распрацаваць пытаньне аб стварэньні апорных комсамольскіх пунктаў у выглядзе камітэтаў пры МТС, саўгасах і буйнейшых колгасах з аб'яднаньнем імі комсамольскіх ячэек мяжуючых сёл і колгасаў.

6. Абавязаць абкомы, крайкомы і ЦК нацкомпартый на працягу 1931 году правесьці перападрыхтоўку на кароткатэрміновых курсах ўсіх сакратароў комсамольскіх ячэек у колгасах, даручыўшы культпропу ЦК ОГІЗУ і ЦК УсеКСМ ў 2-х дэкадны тэрмін распрацаваць програмы перападрыхтоўкі і забясьпечыць курсы педагогічным кіраўніцтвам і адпаведнай літаратурай.

7 Абавязаць культпроп ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ ў месячны тэрмін распрацаваць мерапрыемствы на стварэньню для ячэяк комсамолу неабходнай масавай, політычнай і тэхнічнай літаратуры і забясьпечыць прасоўваньне яе з тым, каб у кожным колгасе была організавана бібліотэка. Культпропу ЦК і ЦК УсеЛКСМ узмацніць асьвятленьне партыйным і комсамольскім друкам работы комсамолу ў галіне колектывізацыі, асьвятляючы работу і практыку дзейнасьці колгасных ячэек.

Па-ўдарнаму сустрал[і] сяўбу

Бягомльская раённая орга[нізацыя] ЛКСМБ разам з колгасамі р[аёну] па-ўдарнаму сустракае 2-ю ба[льша]віцкую сяўбу. Напярэдадні вы[хаду] ў поле на райорганізацыі комс[амо]лу былі праведзены зьлёты ко[лгас]нае і бядняцка-серадняцкае мо[ладзі]. На зьлётах моладзь абвяшчала [сябе] ўдарнікамі імя „2-й бальшавіцк[ай]". Акрамя гэтага, быў праведзены зьлёт комсамольцаў. Увесь ра[ён] актыў да самага пачатку сяў[бы] ў час сяўбы знаходзіцца непаср[эдна] ў сельсаветах

У выніку ўдарнай работы [у] вышаў у поле з 45 проц. коле[ктыв]ізаваных гаспадарак.

Бярэзінскі і Бягомльскі сел[ьса]веты ў асноўным скончылі суц[эль]ную колектывізацыю.

Пост „ЧЗ" Бонда[р]

Ударная брыгад[а] імя „КІМ"

У колгасе „Чырвоны Ма[й]" (Случчына) назіраецца мас[авы] прыліў колгаснай моладзі ў ком[со]мол. За апошнюю дэкаду ў ячэ[йку] ўступіла 6 новых комсамольц[аў]. Пры ўступленьні ў комсамол [яны] абавязаліся быць ударнікамі ў п[ра]вядзеньні вясеньняй пасеўнай к[ам]паніі.

На час сяўбы комсамольцы ор[га]нізавалі ўдарную брыгаду імя „КІ[М]".

Комсамольцы ўзялі на сябе а[бо]вязак выканаць пастанову ўсеса[юз]нага зьезду комсамолу аб перат[ва]рэньні КСМ у шматмільённую ор[га]нізацыю. Кожны комсамолец, а т[ак]сама і ўнеўуступіўшыя ўвяліся [у] вясеньнюю пасеўную кампан[ію] уцягнуць лепшую частку колгас[най] моладзі ў комсамол.

Я. Канончык.

Організаваны кол[]гас „Бальшавічка"

(м. Заслаўе.)

У вёсцы Вышкава, Гатовіска[га] сельсавету, у час растлумачэньня [па]станоў УІ-га зьезду саветаў орга[ні]заваўся з 34-х гаспадарак колг[ас]. Асаблівую актыўнасьць і ініцыяты[ву] ў організацыі колгасу выявілі жа[н]чыны бядначкі і серадначкі. У [з]знаку гэтага, новаму колгасу да[лі] назва „Бальшавічка". Колгасьні[кі] абвясьцілі сябе ўдарнікамі па па[д]рыхтоўцы і правядзеньню вясеньн[яй] сяўбы і організацыі новага прыл[іву] ў колгасы.

С. Бальшавіцкі

УДАРНІКІ ІМЯ „518 і 1.040"

1-га мая ячэйка ЛКСМБ пры колгасе „Расьсьвет пераможца" склікала зьлёт колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі Майскага с-савету па пытаньню аб заклiку тульскіх рабочых.

Пасьля сходу ўся комсамольская ячэйка і беспартыйныя колгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя „518 і 1.040" організавалі 3 брыгады.

На заўтра ўвесь колгас, які налічвае больш 185 гаспадарак, вышаў ў поле. Колгас да выхаду ў поле перашоў на зьдзельшчыну.

Комсамольская ячэйка выклікае на соцспаборніцтва комсамольцаў колгасу імя 11-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі. Кавалёў.

ЗАВЯРШАЕМ СУЦЭЛЬНУЮ

Гэтымі днямі, першым у Старасельскім с-савеце (Капыскага раёну), выйшаў у поле колгас „Бальшавік".

Комсамольская ячэйка колгасу, напярэдадні выхаду ў поле, організавала брыгаду з 15 чалавек. Брыгада мобілізавалася на ўвесь час правядзеньня сяўбы.

Да кожнага новага колгасу Старасельскага с.-савету ячэйка прымацавала комсамольцаў старых колгасаў, якія дапамогуць колгасам і ячэйкам організаваць сяўбу.

Комсамольская ячэйка Старасельскага колгасу ў час падрыхтоўкі да сяўбы організавала 3 новыя колгасы і закончыла кантрактацыю.

Пасьпяховая работа комсамольскіх ячэек с-савету пад кіраўніцтвам парт'ячэек па пераводу колгасаў на зьдзельшчыну дала магутны прыліў у колгасы, дзякуючы чаму с.-савет напярэдадні суцэльнай колектывізацыі. — 80 проц бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасах.

Ударная юнкораўская брыгада „Ч. З." Генін. Росман і Батурэвіч.

Матар'ял к бюро ЦК ЛКСМБ

МЫ Б'ЕМ ТРЫВОГУ

Проекты спэцыялізацыі раёнаў перабліталіся ў цішы габінэтаў, інстытутаў і ільнаводных цэнтраў

Будаўніцтва 47 ільнаводных заводаў зрываецца

У 1931 годзе пасеўная плошча лёну дасягае 24 тысяч га і канапель—40 тысяч га. Супроць мінулага году плошча пад ільном павялічана на 160 тысяч га, над канаплямі—на 18 тысяч. Гэтае плошча насеву разьмяркоўваецца па сэктарох наступным чынам:

У саўгасах—8,0 проц., у колгасах—38,5 проц. і ў аднаасобным сэктары—53,4 проц.

Закантрактавана на 30-е красавіка: лёну 69 проц., канапель 89 проц. У той час, калі рэспубліканскі плян выкананы на 89 проц., ільнаводныя раёны выканалі плян кантрактацыі на 63 проц.

Насеньнем пасеўплошча лёну забясьпечана. Не хапае 650 тон насеньня для пасеву канапель.

Інстытуту рэконструкцыі сельскае гаспадаркі пры СНК імя Леніна было даручана распрацаваць плян спэцыялізацыі раёнаў БССР,

Як-жа ён выканаў гэту задачу?

Раёны, раней залічаныя да ільнаводных і пачаўшыя спэцыялізацыю ў гэтым напрамку, па наметцы інстытуту рэконструкцыі сельскай гаспадаркі атрымалі зусім іншы ўхіл (Лепельскі, Касьцюковіцкі і інш.). У Талочынскім раёне Ільнаводцэнтр запроектаваў пабудаваць пеньказапрацоўчы завод. Падрыхтаваны і дастаўлены будаўнічыя матар'ялы, набрана рабочая сіла і праведзены рад іншых мерапрыемстваў для пабудовы заводу. Згодна-ж проекту Інстытуту, раён аднесены па спэцыялізацыі да жывёлагадоўчых, з бульбяным ухілам.

Плян будаўніцтва заводаў для першапачатковай перапрацоўкі лёну і канапель у такім пагражаючым стане, што ёсьць пэўная пагроза зрыву будаўніцтва гэтых заводаў па БССР. За гэты год павінна быць пабудавана 47 заводаў, з якіх 4 на перапрацоўцы канапель. Проекты пабудоў не гатовы і няма ніякай магчымасьці прыступіць да будаўніцтва. Не хапае рабочай сілы.

Па лініі спэцыялізацыі ільнаводных раёнаў існуе некалькі цэнтраў, адзін ад другога паасобку праводзяць работу. Напрыклад, Галоўленком займаецца організацыяй тэрыторыі, Ільнаводцэнтр—будаўніцтвам заводу, а Ленапенькаапрацоўка атрымлівае пабудаваныя заводы і займаецца апрацоўкай лёну. Такая організацыйная неразьбярыха кіраўніцтва прывяла да таго, што будаўнічымі матар'яламі заводы не забясьпечаны. Завезена круглага лесу 76 проц. супроць пляну, пілаванага матар'ялу 5 проц., цэглы 10 проц., каменю 18 проц., вапны 12 проц., цэманту 20 проц. і г. д.

Цікава адзначыць яшчэ адзін момант у працы Інстытуту рэконструкцыі. Згодна запроектаваных ім пляпаў, крывая пасеўплошчы лёну, замест уздыму, паніжаецца. Для 1932 году (па іх наметках) прырост складае 40 тысяч, а для 1933 году, калі ў асноўным павінна быць закончана суцэльная колектывізацыя, прырост складае толькі 20 тысяч га. Такі-ж малюнак і з канаплямі. Пастановы VI зьезду саветаў аб спэцыялізацыі СССР ставяць якраз адваротныя задачы. Прырост тэхнічных культур павінен ісьці ўверх.

Трэба зараз-жа стварыць скразны комсамольскі кантроль над будаўніцтвам 47 заводаў па перапрацоўцы сыравіны. Спыніць сьвістапляску ў складаньні проектаў па спэцыялізацыі раёнаў. Абгаварыць проекты не ў габінэтах інстытутаў, а перанесьці бліжэй да мас, да сапраўднасьці.

Трэба раз назаўсёды разьмежаваць і ўстанавіць раёны па спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі Беларусі. Палепшыць сыстэму кіраўніцтва ільнацэнтраў.

Будаўніцтва 47 заводаў—пад пагрозай зрыву. Мы б'ем трывогу! Бюро ЦК ЛКСМБ, якое будзе разьбіраць гэта пытаньне, прыме адпаведныя захады. ЦКК РСІ павінна ўмяшацца ў гэтую справу і адвесьці пагрозу зрыву спэцыялізацыі ільнаводных раёнаў.

Г. Логвін.

Ачысьціць сельсавет ад кулацкіх агента[ў]

Плешчаніцы (ад нашага юнкора). Амнішаўскі с-савет у канцы мінулага году быў колектывізаваны на 54 проц. Але далей праца па колектывізацыі не праводзіцца. За час падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак няма. Фактычна колектывізацыя спынілася. За 5 апошніх месяцаў не праводзіцца ніякай політычна-масавай работы па колектывізацыі сярод аднаасобнікаў.

Работа з беднатой—закінуты вучастак. „Ня наша справа праводзіць работу з беднатой,—ім зьезд якраз сказаў: за колгас ці супроць колгасу, дык хай ідуць",—так заяўляе старшыня с-савету Бабскі.

Некаторыя колгасы засьмечаны кулацкімі элементамі. Напрыклад, у колгас „Новы луч" прынята 8 заможных гаспадарак і сям'я царкоўнага служкі. У колгас „Чырвоная Слабада" пралезла пяць кулацка-заможных гаспадарак. У колгас „Комсамолец" прыняты заможнік Няверка Янка, які плаціў 62 р[уб.] падатку. У гэтыя колгасы ня[ма] прыліву бядняцка-серадняцкіх гас[]падарак.

Склад працаўнікоў с-савету так[]сама засьмечаны клясава-варожы[мі] элемэнтамі. Сэкратар с-савету Дуне[ц] кулацкі агент, ён захаваў у свае[й] гаспадарцы ад налічэньня падатк[у] каня, карову і зямлю. За бязьдзей[]насьць у с-савеце Дунец быў асу[]джаны на 6 месяцаў прымусовы[х] работ, але чамусьці застаўся пра[]цаваць сэкратаром с-савету.

Партыйная і комсамольская ячэй[]ка аднесьліся прымірэнча да прав[а]опортуністычнай практыкі ў працы сельсавету, ня здолелі ўскрыць правыя прарывы і зрабіць з іх політычны вывад.

Трэба прыняць самыя суровы[я] меры да конкрэтных вінавайцаў, якія патураюць кулакам і праводзяць права-опортуністычную практыку ў колектывізацыі.

А. Заслаўскі.

3-му ўсебеларускаму зьезду чыгуначнікаў—баявое комсамольскае прывітаньне

Профсаюзы чыгункі ТВАРАМ да ўдарнікаў, брыгады і цэху!

Комсамолія чыгункі, сумесна з профсаюзамі, павінна дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня гістарычнай адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР

Пачаўся III усебеларускі зьезд чыгуначнікаў

5-га мая адкрыўся 3-ці Усебеларускі зьезд чыгуначнікаў.

Выступіўшы з дакладам старшыня Белбюро ЦК чыгуначнікаў т. Бэрзінг указаў, што адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР унесла значны зрух у работу чыгуначных вузлоў. Выкліканая ёю актыўнасьць і энтузіязм рабочых чыгуначнікаў накіраваны на падцягненьне транспорту да перадавых галін гаспадаркі.

Дакладчык прыводзіў рад фактаў організацыі суботнікаў, дзённікаў штурму для аздараўленьня паравознага парку, рост ударніцтва, соцспаборніцтва і перавод яго ў вышэйшыя формы.

Асабліва гэта датычыць паравознікаў, якія ў сьвязку з ліквідацыяй абязьлічкі самі рамантуюць паравозы і прыводзяць іх у належны выгляд.

Тав. Бэрзінг спыніўся на недапушчальных прарывах у сэнсе організацыйнага замацаваньня спаранай язды. Толькі ў адным Гомельскім раёне за сакавік месяц было 117 зрываў спаранай, у Жлобінскім—25, што тлумачыцца дрэннай падборкай брыгад і г. д.

Ня гледзячы на павялічэньне колькасьці ўдарнікаў, рамонт да гэтага часу па раду „вузлоў праводзіцца дрэнна. Працдысцыпліна на Віцебскім, Гомельскім і інш. вузлах пастаўлена нездавальняюча. Так, у Аршанскім раёне за сакавік месяц было 133 прагулы.

— Такім чынам,—кажа т. Бэрзінг,—профсаюзныя організацыі яшчэ не павярнуліся ў належнай меры тварам да транспорту, профорганізацыі яшчэ не наладзілі кіраўніцтва ўдарніцкім рухам.

Далей дакладчык гаворыць аб матар'яльна-бытавых умовах чыгуначнікаў і асаблівую ўвагу удзеляе крытыцы і самакрытыцы. Тут рад буйнейшых прарываў. Так, гомельскі і іншыя райпрофсачы на працягу 6-ці месяцаў не адказваюць на рабкораўскія допісы.

Тав. Бэрзінг адзначыў слабую пастаноўку культурна-масавай работы сярод чыгуначнікаў і асабліва затрымаўся на пытаньнях беларусізацыі чыгуначных вузлоў. Ён прывёў рад фактаў вялікадзяржаўнага шовінізму і адзначыў, што профорганізацыі не вядуць патрэбнай барацьбы з гэтымі зьявамі.

У спрэчках, якія разгарнуліся пасьля дакладу т. Бэрзінга, выступаўшыя таварышы з бязьлітаснай крытыкай ускрывалі прычыны зрываў спаранай язды ў паасобных раёнах, адсутнасьць вучоту ўдарніцтва, дрэннае кіраўніцтва і г. д.

Асаблівая увага ў спрэчках удзеляецца пытаньню далейшага разгортваньня соцспаборніцтва, ударніцтва і падрыхтоўкі кадраў.

Некаторыя гаспадаркі нядбайна адносяцца да школ ФЗВ, вучням не даюць паравозаў для практыкі.

Пост „Чырвонай Зьмены"—дэлегат зьезду—Фінкельштэйн.



35 проц. зварочваюцца ў дэпо

Менскі вузел павінен дабіцца пераломy

Да гэтага часу адозва ЦК УсеКП(б) і СНК на Менскім чыгуначным вузьле рэалізуецца надзвычайна марудна.

Адміністрацыя малога рамонту станцыі Менск нават ня ведае аб тым які процант трамфінпляну выканан за першы квартал. А ў гэты час значна зьніжаецца якасьць рамонту, вагоны праз два-тры дні пасьля рамонту зварочваецца ў дэпо.

У паравозным парку паўторны рамонт увашоў у сыстэму, 35 проц. паравозаў датэрмінова ідуць ў дэпо.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва разгорнута дрэнна. У комсамольскай ячэйцы ёсьць адна ўдарная брыгада а далей справа ня рушыцца.

Рэорганізацыя партыйна-комсамольскай работы праходзіць дрэнна; ня ведаюць яшчэ дзе організаваць ячэйкі: у цэху, ці брыгадзе. Праверка выкананьня дадзеных дырэктыў не вядзецца.

Трэба зараз-жа зрабіць рэзкі пералом у рабоце комсамольскай організацыі Менскага чыгуначнага вузла.

М-каў.

Адказваць за паравоз

З пастановы бюро Гомельскага гарадзкога камітэту комсамолу па дакладу колектыву ЛКСМБ 9-га вучастку Цягі.

Бюро гаркамолу адзначае, што:

Бюро колектыву ЛКСМБ 9 вучастку Цягі не разгарнула растлумачальную працу вакол значэньня адозвы ЦК і СНК. Комсамольская ячэйка недастаткова мобілізавала комсамольскую організацыю на штурм прарыву на транспорце.

Бюро комсамольскай ячэйкі ня стала на чале вя ікага энтузіязму рабочае моладзі не мобілізавала ўсіх комсамольцаў і беспартыйную рабочую моладзь на ліквідацыю прарыву, не сыгналізавала аб становішчы ДЭПО і рашуча не змагалася з прагуламі, дрэннымі паводзінамі і г. д.

Комсамольская ячэйка не пацхапіла і не рэалізавала рашэньні зьездаў і Гаркому комсамолу аб паходзе за тэхнікў, не старалася, каб кожны комсамолец, кожны малады рабочы аўладаў тэхнікай сваёй справы.

Бюро ГК пастанаўляе:

За опортуністычныя адносіны да рэалізацыі адозвы ЦК і СНК, за спадзеўку на самацёк, за невыкананьне дырэктыў Гаркамолу ў галіне політвучобы, тэхнікі, ваенізацыі, працы з юнкорамі, за опортуністычныя адносіны да нацполітыкі,—бюро комсамольскай ячэйкі распусьціць.

Паказаць бюро комсамольскай ячэйкі на неабходнасьць больш рашуча змагацца з усімі, хто перашкаджае аздараўленьню цягніковага парку, ставячы па-за шэрагаў комсамолу ўсіх тых, хто не змагаецца за здаровы паравоз.

Карэнным чынам палепшыць якасьць рамонту, устанавіўшы пэрсанальную адказнасьць за яго правядзеньне, аддаць пад грамадзкі суд усіх, хто нядбайна адносіцца да аздараўленьня парку.

Комсамольскай ячэйцы, сумесна з партыйнай ячэйкай і профорганізацыяй, вызначыць конкрэтныя мерапрыемствы для аздараўленьня паравознага парку, палепшыць усю сыстэму работы, абвясьціць рашучую барацьбу прастоям паравозаў.

Прапававаць бюро комсам. ячэйкі тэрмінова разгарнуць працу па мобілізацыі ўсёй рабочай масы ДЭПО на ліквідацыю прарыву, разгортваючы бальшавіцкую крытыку і самакрытыку ва ўсёй рабоце, мобілізуючы энтузіязм усіх комсамольцаў і рабочае моладзі на зьнішчэньне недахопаў у рабоце, за поўнае і сваячасовае выкананьне рамонту, ахапіўшы ўсіх комсамольцаў і рабочую моладзь соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Да бюро ЦК ЛКСМБ

ПЕРАЛОМУ ЯШЧЭ НЯМА— ПЕРАЛОМ ПАВІНЕН БЫЦЬ

Тэмпы росту КСМ Менску не забясьпечваюць ператварэньня саюзу ў шматмільённую організацыю

Месячнік агляд-праверкі працягваем

Сёньня мы зьмяшчаем другую пастанову бюро МенГК ЛКСМБ па справаздачах колектываў фабрыкі „Кастрычнік", абутковай фабрыкі, ФЗВ „КІМ" і шчотачнай аб становішчы росту гэтых організацый.

У сваёй пастанове бюро жорстка б'е кіраўніцтвы гэтых колектываў, якія ня здолелі на належную вышыню паставіць работу сярод беспартыйнай рабочай моладзі, ня здолелі як сьлед уключыцца у агляд-праверку, ня здолелі ўвязаць сваю штодзённую работу на вытворчасьці ва ўдарных брыгадах з пашырэньнем сваіх радоў.

На вуроках гэтых колектываў павінна вучыцца ўся комсамольская організацыя Беларусі, таму, што такое становішча ня толькі ў Менску, але ў цэлым шэрагу іншых організацый.

Сёньня бюро ЦК ЛКСМБ будзе слухаць справаздачы Менскага і Гомельскага Гаркомаў ЛКСМБ аб росьце.

Побач з радам мерапрыемстваў, якія бюро ЦК прыме па выкананьню рашэньняў 9-га зьезду ЎсеЛКСМ аб шматмільёным комсамоле, мы лічым неабходным месячнік агляду-праверкі, які праводзіўся „Чырвонай Зьменай" у Менску, ператварыць ва ўсебеларускі месячнік агляду-самаправеркі росту комсамолу.

Мы лічым неабходным працягнуць яшчэ на месяц наш агляд-праверку па Менску.

Гаркому комсамолу прапануем, сумесна з „Чырвонай Зьменай" узяць пад кантроль ячэйкі з-ду „Комунар", ФЗВ КІМ і 1-го колгасу з тым, каб дапамагчы ім наладзіць масавую работу сярод беспартыйнай рабочай моладзі па выкананьню лёзунгу зьездаў аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю.

Застыглі на месцы

У комсамольскім колектыве заводу „Бальшавік" налічваецца зараз каля [illegible]0 чалавек. Гэтыя лічбы вы маглі лічыць і два месяцы таму назад.

Брыгада „Ч. З." па праверцы становішча росту, у гутарцы з сэкратарамі цэхавых ячэек, чула такія адказы:

—У нашым цэху ёсьць усе магчымасьці для росту, але калі пытаеш у хлапцоў чаму яны не ўступаюць у комсамол, дык яны кажуць, што лепш пайсьці ў партыю, чымся ў комсамол,—так заявіў сэкратар комсамольскай ячэйкі другога хромавага цэху—Ханін.

—Асаблівай працы з беспартыйнай моладзьдзю мы не вядзем. Прапануем уступіць у комсамол, але яны адмаўляюцца,—гэта тлумачэньне сэкратара ячэйкі першага хромавага цэху—аднаго з буйнейшых цэхаў на заводзе—т. Дымінштэйна.

Лепш справа з ростам у ячэйках жэлацінавага і мэханічнага цэхаў. Ячэйка мэханічнага цэху вырасла за апошні час на 4 чалавекі. Есьць толькі яшчэ 2 чалавекі, за лік якіх можна вырасьці. Ячэйка ставіць перад сабой задачу: у бліжэйшы тэрмін уцягнуць іх у комсамол і ў грамадзкую працу ў політгуртках.

У мэханічным цэху 5 чалавек беспартыйнай моладзі падалі заявы аб уступленьні ў комсамол.

Брыгада „Ч. З" М[illegible]нін, Энцін, Райдэр

ПАСТАНОВА

бюро Менгаркому ЛКСМБ аб становішчы росту КСМ у яч.: Комунар, Кастрычнік, БЖС, абутковай, шчотачнай, МШВ, ФЗВ швэйн.

Заслухаўшы інформацыі: сэкратароў к-ваў і садаклады аб аглядзе становішча росту КСМ: Комунар—Канопік. Рудніцкі; Кастрычнік—Малкіна, Канопік; БЖС—Вайнштэйн, Янковіч; абутковая—Хазанаў; шчотачная—Вігдорчык, МШВ—Тарлоўскі, ФЗВ швэйнікаў—Хэйман,—Бюро ГК ЛКСМБ прызнае становішча і тэмп росту па вышэйадзначаных к-вах і яч. зусім нездавальняючым. Комунар—рабочай моладзі 310, у КСМ—264 чал. Кастрычнік—раб. моладзі 650, у КСМ—300. БЖС раб. моладзі 171, у КСМ—100. Абутковая—раб. моладзі 406 у КСМ—215. Шчотачная—раб. моладзі 350, у КСМ—140. МШВ—532, у КСМ—226—ФЗВ швэйн,—743, у КСМ—230.

Усяго рабочай моладзі ў адзначаных прадпрыемствах—3162, у КСМ—1475. Такім чынам, па праверaных 7-мі організацыях агульны проц. ахопу раб. моладзі КСМ складае ўсяго 46,33 проц. Асабліва Бюро адзначае, што нездавальняючае становішча росту маецца па к-вах шчотачнай, абутковай і ф-кі Кастрычнік. Нецярпіма слабае становішча росту тлумачыцца тым, што кіраўніцтва гэтых к-ваў, асабліва шчотачнай, абутковай і Кастрычніка, не мобілізавала КСМ масу на выкананьне рашэньняў ІХ-га зьезду аб ператварэньні КСМ у шматмільённую організацыю, не праводзілі ніякай выхаваўчай працы сярод беспартыйнай раб. моладзі ў напрамку давядзеньня да яе рашэньняў IX і X зьездаў КСМ.

Падкрэсьліваючы правільнасьць цадзенай ацэнкі ў рашэньнях Бюро Г. К. ад 27—ІУ-31 г. па пытаньню аб становішчы росту ў горадзе, Бюро Гаркому констатуе, што яшчэ да гэтага часу к-вы і яч. ня ўзьнялі на належную прынцыповую вышыню лёзунг барацьбы за шматмільённы комсамол, не разгарнулі масавай работы па гэтаму пытаньню, Лічачы, што такое становішча росту зусім нецярпіма, Бюро Г. К. ЛКСМБ пастанаўляе;

1. Сэкратара к-ву КСМ шчотачнай ф-кі тав. Парахневіча з працы зьняць;

2. Сэкратару к-ву ф-кі Кастрычнік тав. Малкінай вынесьці вымову;

3. За несваячасовае афармленьне анкет, сэкратару яч. БЖС тав. Вайнштэйну паставіць на від;

4. Папярэдзіць к-тыў зав. Комунар аб неадкладным разгортваньні масавай работы па 100 проц. уцягненьню раб. моладзі ў КСМ.

5. Ухваліць мерапрыемствы к-ваў МШВ і ФЗВ швэйн. па пытаньнях масавай работы ў галіне росту КСМ, констатуючы, аднак, з усім нездавальняючае становішча росту КСМ у сучасны момант. Катэгорычна прапанаваць к-вам МШВ і ФЗВ швэйн. замацаваць узятыя тэмпы па разгортваньню масавай работы і ўцягненьню ў КСМ.

6. Прапанаваць усім к-вам і яч. ЛКСМБ зараз-жа абгаварыць пастанову Бюро Г. К. ЛКСМБ па росту ад 27—ІУ і 3—У-31 г. і прыняць рашучыя захады, з тым, каб забясьпечыць выкананьне гэтых пастаноў;

7. 14-га мая склікаць нараду сэкратароў гарадзкіх і колгасных вясковых яч. па пытаньню праверкі выкананьня гэтай пастановы. На нарадзе заслухаць інфармацыі к-ваў: Кастрычніка, Бальшавіка, Энэргіі, Белдзяржбуду, Цягі, Камунаркі, „ДА", саўгасу Вішнёўка.

8. Даручыць орг. аддз. неадкладна наладзіць масавы выбарчы агляд комсамольскіх к-ваў і яч. па пытаньню росту ў разрэзе выкананьня пастаноў ГК.

9. 10 мая заслухаць на бюро ГК даклады аб росьце КСМ на вёсцы.

10. 20 мая на бюро ГК заслухаць даклады орг аддз. аб агульным становішчы росту па Менскай організацыі ЛКСМБ.

Ажыцьцявіць спараную язду

Спараная язда на Віцебскім чыгуначным вузьле праведзена недастаткова. Спазьненьне цягнікоў—„нормальнае" зьявішча. Адміністрацыя вузла на гэта не рэагуе. Комсамольская організацыя Віцебскага вузла павінна не на словах, а на справе ажыцьцявіць спараную язду.

Каночык.

Операцыйная зводка

У барацьбе за бальшавіцкі фінплян

Вопыт „Варашылаўцаў“--усяму комсамолу

Соцыялістычны дагавор з Украінай павінен быць выкананы. Да адказнасьці зрыўшчыкаў выкананьня дырэктыў партыі і ўраду

У барацьбе за выкананьне конкрэтных абавязкаў па фінпляну, комсамол Беларусі ідзе няроўным фронтам. Ёсьць адсталыя, ёсьць і перадавыя.

Комсамольцы Зембіна выканалі заданьне на 0,22 пр. Комсамол Барысаву ня выконвае сваіх абавязкаў. Нават на ўсе комсамольцы зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкас. Гэтыя факты яўнага опортунізму на фоне 172-проц. выкананьня кантрольных лічбаў па мобілізацыі сродкаў ашчадкасаю заводу імя Варашылава, дзе комсамольскі колектыў паказаў прыклад сапраўды бальшавіцкай барацьбы, паказаў прыклад конкрэтнага ажыцьцяўленьня ўзятых абавязкаў у штодзённай працы, сьведчаць аб тым, што невыкананьне кантрольных лічбаў ёсьць вынік бязьдзейнасьці.

Мы пытаемся: чаму комсамол Барысава, Барысаўскі РК Комсамолу не ажыцьцяўляе ўзятых абавязкаў.

Чаму Зембінская комсамольская ячэйка дала ганебную лічбу 0,22 проц.? Адкажэце перад усім комсамолам!

Баявы вопыт „варашылаўцаў“— усёй організацыі

МЕНСК. Пры аглядзе ўдзелу комсамольскай організацыі ў мобілізацыі сродкаў праз ашчадкасу быў выяўлены добры вопыт працы комсамольскага колектыву заводу імя Варашылава.

Дзякуючы таму, што комсамольскі колектыў прымае практычны ўдзел у наладжаньні працы заводзкай ашчадкасы і шырока разгарнуў вярбоўку новых укладчыкаў,

Ашчадкаса № 102 заводу імя Варашылава выканала кантрольныя лічбы па мобілізацыі сродкаў на 1-шы квартал на 172 пр.

Зараз комсамольскі колектыў заводу працуе над ўвядзеньнем вопыту ленінградзкага заводу імя Карла Маркса па конвэернай выдачы зарплаты і безнаяўных разьлікаў.

Вопыт комсамольцаў заводу імя Варашылава павінен стаць набыткам ўсяе комсамольскае організацыі

Комсамольцы „варашылаўцы“ павінны паказаць вопыт сваёй працы. Мы зьвяртаемся да комсамольцаў заводу імя Варашылава.

Пакажэце, як вы дасягнулі посьпеху ў барацьбе за фінплян, як вы ўдзельнічалі ў організацыі працы заводзкай ашчадкасы, як вы праводзілі масавую працу на заводзе.

Кожны комсамольскі колектыў, кожная комсамольская ячэйка павінна азнаёміць з працай комсамольцаў заводу імя Варашылава.

Організуйце пасылку комсамольскіх брыгад на завод імя Варашылава для вывучэньня станоўчага вопыту барацьбы за фінплян.

Чакаем матар'ялаў ад комсамольцаў заводу імя Варашылава.

У бягучых справах

БАРЫСАЎ. 6. Фінплян за 1-шы квартал 31 году Зембінская ашчадкаса (Барысаўскі раён) выканала толькі на 33 проц. Месячнае заданьне за красавік выканана на 64,5 проц.

Увага комсамольцаў не мобілізавана вакол задач выкананьня фінпляну. У ячэйцы нават не распрацавана соц. умова комсамолу Беларусі з комсамолам Украіны. Пытаньні выкананьня фінпляну абгаварваюцца на сходах ячэйкі выключна ў бягучых справах. Далёка ня ўсе комсамольцы зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы, ня ўсе падпісаліся на пазыку.

А. В.—р.

Заданьне выканана на... 0,22 проц.

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Па заданьню РК комсамолу Стара-Дароская ячэйка пры комбінаце „Пролетары“ павінна была завербаваць ўкладчыкаў ў ашчадкасу на суму 954 рублі

Аднак бюро комсамольскай ячэйкі ні разу не праверыла як выконваецца заданьне, не мобілізоўвала ўсіх комсамольцаў і беспартыйную моладзь на барацьбу за яго выкананьне, не правяла ніякай растлумачальнай працы сярод рабочых—весь чаму заданьне выканана на 2 рублі. Ня ўсе комсамольцы зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы.

Ячэйка не дала адпору шкодным думкам і разважаньням аб немагчымасьці быць укладчыкам ашчадкасы. Клясавы вораг дзейнічаў не сустракаючы адпору.

М. Ш.

Абавязкі па соц-умове ня выконваюцца

БАРЫСАЎ. Абавязак 100 проц. уцягненьня комсамольцаў у ашчадкасы ня выкананы. Комсамольцы толькі на 50 проц. зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкас. Не праведзена ніякай працы па распаўсюджаньню безнаяўнага разьліку.

Кіраўнікі комсамольскіх ячэек па-кавённаму аднесьліся да выкананьня соцумовы.

РК ЛКСМБ не кіраваў, не організоўваў гэтай працы, абмяжаваўся толькі габінэтным разьмеркаваньнем кантрольных лічбаў, рассылкай паперак ячэйкам.

РК комсамолу заслухаў справаздачы паасобных колектываў аб іх удзеле ў выкананьні соц. умоў, але вынесеныя пастановы ня выконваліся, бо за гэтым ніхто не сачыў.

Выкананьне абавязкаў у Барысаўскай організацыі—пад сур'ёзнай пагрозай зрыву.

Соц. умова з Украінай павінна быць выканана. Тут патрэбна сапраўды ўдарная, напружаная праца ўсяе організацыі, сталае практычнае кіраўніцтва організацыі.

Комсамол Барысаўшчыны павінен дабіцца, каб кантрольныя заданьні былі выкананы на 100 проц.

Шостак.

Лепшыя ударнікі вытворчасьці і трактароў у адзнаку юбілею „ЧЗ“ папаўняюць рады ленінскага комсамолу

Абвяшчаю сябе ўдарнікам „ЧЗ“

З 25-га году я пачаў чытаць сваю комсамольскую газэту „Чырвоная Зьмена“ У 30 г я ўжо пачаў у яе пісаць. Праўда, спачатку мае дописы зьмяшчаліся мала, але потым яны сталі зьяўляцца на старонках „Чырвонай Зьмены“ ўсе часьцей.

Уразумеўшы лёзунг партыі і комсамолу, што кожны юнкор павінен быць ўдарнікам і кожны ўдарнік юнкорам, абвяшчаю сябе ўдарнікам-юнкорам і ўдарнікам па распаўсюджваньню газэты „Чырвоная Зьмена“, Таксама абавязваюся організаваць юнкор-брыгады і праводзіць сярод іх працу па організацыі колектыўнага матар'ялу ў газэту „Чырвоная Зьмена“.

Пінчук.

У падарунак юбіляру--скразная імя „ЧЗ“

Комсамольская ячэйка ІХ-й групы бручнага цэху ф-кі „Сьцяг Індустрыялізацыі“ (Віцебск) к 10-ці годзьдзю „ЧЗ“ організавала з 8 чалавек скразную брыгаду імя „Чырвонай Зьмены“.

Брыгада бярэ на сябе наступныя абавязкі:

Выканаць з перавышкай промфінплян. Змагацца за якасьць выпусканай продукцыі. Узьняць працдысцыпліну, і яшчэ цэлы рад конкрэтных абавязкаў.

Брыгада з 8-мі асоб.

Недаацэньваюць ролі „Ч. З.“

„Чырвоную Зьмену“ я чытаю і выпісваю ўжо даўно. Чытаў я яе ў той час, калі яна выходзіла тры разы ў тыдзень на расійскай мове. Чытаю і зараз, калі яна стала штодзённай і выключна беларускай.

„Чырвонка“—мой лепшы памочнік у працы.

Аднак, некаторыя ячэйкі недаацэньваюць ролі „Чырвонкі“ як кіраўніка комсамольскай працы і барацьбіта за генэральную лінію партыі. Напрыклад, у Вітуніцкім сельсавеце (Бягомльскі раён) выпісваецца ўсяго 6 экз. „Ч. З.“,

Не адстаюць ад Вітуніцкай ячэйкі Асноўская і Вольберачынская і інш.

Патрэбна зараз-жа наверстаць упушчанае і змагацца па-сапраўднаму за 60-тысячны тыраж.

Кожны павінен памятаць, што „Чырвонка“ сапраўды зьяўляецца дапаможнікам у справе ліквідацыі ўсіх недахопаў у практычнай працы.

М. ГЕЦ

Ніводнага комсамольца без „Чырвонкі“

У Менскім політэхнікуме сувязі шырока разгарнулася падрыхтоўчая праца да юбілею „Ч. З.“.

На кожным аддзяленьні вылучаны ўпаўнаважаныя па падпісцы на „Ч. З.“. Замест 19 экз., якія мы мелі раней, зараз мы ставім сваёй мэтай на 100 проц. ахапіць усіх студэнтаў тэхнікуму падпіскай на „Ч. З“. Гэтым самым непасрэдна выканаем пастанову ЦК ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу „Ч. З.“ да 60 тысяч.

Таксама бярэм на сябе абавязак наладзіць працу насьценгазэты нашага тэхнікуму, асьвятляючы ход соцспаборніцтва і ўдарніцтва, акадэмпасьпяховасьць студэнтаў, выкрываючы ілжэўдарнікаў.

Да юбілею „Ч. З.“ наш лёзунг: „Ніводнага комсамольца бяз Чырвонай Зьмены“.

А. КЕЗУЛАС

Абвяшчаем сябе ўдарнікамі

Пры Нагоцкай НШМ (Старобінскі раён) у гонар 10-цігодзьдзя „Чырвонай Зьмены“ організавалася ўдарная брыгада юнкораў. Брыгада абвяшчае сябе ўдарнай на пасьпяховае правядзеньне вясновай сяўбы, на наладжваньне ў колгасах працдысцыпліны, на ўцягненьне ў колгасы аднаасобнікаў, беднякоў і серадняков, на выкананьне плянаў 3-га, рашаючага году 5-цігодкі і распаўсюджваньне газэты „Чырвоная Зьмена“.

Брыгада абвяшчае 2-хдэкаднік праверкі і лепшай пастаноўкі працы колгасаў і саўгасаў Нагоцкага с.-савету.

Мы заклікаем юнкораў-адзіночак аб'яднацца ў юнкор-брыгаду, што будзе лепшым падарункам юбіляру „Ч. З.“.

Адначасова з гэтым выклікаем на соцспаборніцтва старасельскую юнкор-брыгаду.

Юнкор-брыгада „Ч. З.“
Малочка, Бэліцкі, Субота, Велапольскі, Барэцькін, Астроўскі, Дубоўскі

Змагацца за 60-цітысячны

У Бароўскай комсамольскай ячэйцы (Лельчыцкі раён) дагэтуль выпісвалася ўсяго 5 экз. „Ч. З.“. Але, у сьвязку з падрыхтоўкай да 10-ці гадовага юбілею „Ч. З.“, ячэйка зрабіла значны пералом у падпісцы.

Зараз вылучаны ўпаўнаважаныя па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“, што дало ўжо значныя посьпехі. Кожны комсамолец падпісаўся на цэлы год і адначасова вядзе вярбоўку падпісчыкаў на „Ч. З.“ сярод беспартыйнае моладзі.

У выніку—падпіска на „Ч. З.“ дасягнула ўжо 50 экзэмпляраў.

„Чырвонка“ на-баявому прасоўваецца ў гушчу працоўнае моладзі.

С. Куцанаў

Працоўныя БССР—на дапамогу працоўным Арменіі

Сьледуйце прыкладу гомельскіх прадпрыемстваў

Фабзавучы, тэхнікумы і ФЗС, прымайце выклік гомельчан

Працоўныя Арменіі пад кіраўніцтвам ленінскай партыі бальшавікоў герэічна змагаюцца за выкананьне задач, якія стаяць перад працоўнымі СССР.

У час напружанай працы на выкананьню плянаў 3-га году пяцігодкі насельніцтва Арменіі пасьцігла стыхійнае няшчасьце—землятрасеньне, якім разбураны дзесяткі вёсак, пакінуты сотні забітых і тысячы параненых.

Мы, фабзавучнікі Гомельскай ФЗВ чыгунічнікаў імя Дзяржынскага, спачуваючы працоўным Арменіі, лічым неабходным неадкладна дапамагчы ім як найхутчэй ліквідаваць разбурэньні

Адлічваем аднадзённы заработак у дапамогу пацярпеўшым ад землятрасеньня ў Арменіі і выклікаем усе ФЗВ, тэхнікумы і ФЗС Беларусі зрабіць тое-ж самае.

Працоўныя Арменіі! Не паддавайцеся паніцы, будзьце стойкімі ў барацьбе са стыхіяй. Мы вам дапаможам у вашай барацьбе.

Агульны сход Гомельскага ФЗВ чыгуначнікаў імя Дзяржынскага.

Разгортваецца масавая дапамога

Гомель. 6. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).—Гарком партыі, комсамолу, і Гарпрофсавет далі дырэктыўныя ўказаньні колектывам і ячэйкам КП(б)Б, ЛКСМБ і фабзаўмясцкомам, каб яны разгарнулі на прадпрыемствах растлумачальную працу аб землятрасеньні у Арменіі і неабходнасьці матар'яльнай дапамогі.

На мітынгу, рабочыя заводу „Пролетары“, выказваючы глыбокае спачуваньне працоўным Арменіі ў зьвязку з стыхійным няшчасьцем, рашылі адлічыць 3 проц, з сваёй месячнай пэнсіі для дапамогі пацярпеўшым ад землятрасеньня.

Рабочыя заводу „Пролетары“ звар[э]чваюцца да рабочых, колгасьнікаў, саўгасьнікаў і беднякоў-серадняков аднаасобнікаў з заклікам неадкладна організаваць матар'яльную дапамогу працоўным Арменіі, каб яны маглі пасьпяхова працягваць сеў 2-ой бальшавіцкай вясны.

Вучні ФЗВ імя Дзяржынскага чыгуначнікаў рашылі адлічыць аднадзённы заробак у дапамогу пацярпеўшым ад землятрасеньня і выклікаюць зрабіць тое-ж самае ўсе ФЗВ, тэхнікумы і ФЗС Беларусі.

Цішка Верны

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

10 мая, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу К. Маркса Гарком КП(б)Б, Гарпрофсавет і Газбюро склікаюць агульную гарадзкую конфэрэнцыю.

На парадку дня:

1. *Соцыялістычнае будаўніцтва і задачы друку;*
2. *Садаклад Газбюро;*
3. *Вялікая мастацкая частка.*

Яўка наступных т.т. абавязкова: упаўнаважаных па друку ячэек КП(б)Б і партколектываў, ячэек КСМ, культпрацаўнікоў і культкамісій фабрычных камітэтаў і мясцкомаў, рэдкалегій насьценных газэт і шматтыражак, рабкораў і ўдарнікаў.

Запрашаюцца прадстаўнікі рэдакцый цэнтральных газэт і выдавецтва, сэкратары парт'ячэек і чытачы партыйнага і комсамольскага друку.

Білеты атрымаць у культпропе Гаркому.

Менгарком КП(б)Б.
Гарпрофсавет.
Газбюро.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599.